Урок беларускай мовы ў 7 класе Талапіла М.М.

**Тэма: Правапіс дзеясловаў з суфіксамі –ава(-ява), -ыва(-іва), -ва.**

**Мэты:** - спрыяць засваенню вучнямі правапісу суфіксаў дзесловаў;
- прадоўжыць фарміраванне агульнавучэбных уменняў і навыкаў: аналіз апорнай схемы, самакантроль, уменне супастаўляць, рабіць вывады, ставіць і рашаць праблемы, даказваць гіпотэзы, уменне весці дыялог;
- ствараць умовы для развіцця крытычнага мыслення, творчых здольнасцей вучняў.

**Тып урока:**урок вывучэння новага матэрыялу.

**Выкарыстаная тэхналогія:** тэхналогія праблемнага навучання.

**Ход урока**

1. **Арганізацыйны момант. Матывацыя.**
2. **Актуалізацыя ведаў:**
   - праверка дам.практ.
3. **Стварэнне праблемнай сітуацыі пры праверцы д/з.**

   **Вызначэнне тэмы, мэт урока.**
   **Падводзячы дыялог.**

| Настаўнік | **Вучань** |
|---|---|
| Праверце, ці правільна вы абазначылі і запісалі суфіксы ў дз. незак. тр.? | У некаторых атрымаліся суф. –ва, у некаторых –ыва,-іва. |
| Чаму так атрымалася? Чаго не ведаем? Як вы думаеце, якая будзе тэма нашага ўрока? | Як пішуцца суфіксы дзеясловаў?Тэма ўрока: Правапіс суфіксаў дз.-ва,-ыва(-іва). |
| **4. Пастаноўка праблемы.** | |
| Якія пытанні ўзнікаюць? | У якіх выпадках пішуцца суф.-ва, -ыва(іва)? |
| Якія мэты мы сёння паставім перад сабой? | Засвоіць правапіс дзеясловаў з суф.-ва, -ыва(-іва). |
| **5. Вырашэнне праблемнай сітуацыі. Пабуджаючы дыялог.** | |
| Прачытайце запісаныя дз., звярніце ўвагу на выдзеленыя суф. Якія ёсць гіпотэзы наконт іх правапісу? | Думаюць, разважаюць. |
| Авалодваць, падпісваць, расчэрчваць -ва пасля адзіночнай зычнай, спалучэнняў зычных не на –р,-л,-н. | |
| Праветрываць, падтрымліваць, адрозніваць –ыва, -іва пасля спалучэнняў зычных на -р,-л,-н. | |
| Падкрэсліце зычныя літары перад суф. дзеясловаў(падказка да рашаючай гіпотэзы) | Вучні падкрэсліваюць |
| Што дало падкрэсліванне? | Перад суф.-ва пішацца адзіночная зычная, а перад –ывы(-іва) – па дзве. |
| У слове”расчэрчваць” перад суф.-ва таксама дзве літары. Якія ёсць яшчэ гіпотэзы? | Вучні думаюць, разважаюць. Можа, гэта залежыць ад таго, якія гэта канкрэтна літары? |

| | |
|---|---|
| Якія робім вывады? Калі пішуцца суф.-ва, -ыва(-іва)? | Робяць вывады, запісваюць у сшытак. |
| Прачытайце пары дз.,якія суфіксы пішуцца ў гэтых дзеясловах?<br>1 асоба адз.лік – незак.трыванне<br>Даследую – даследаваць<br>Пакутую – пакутаваць<br>Малюю - маляваць | -ава (-ява) |
| Якія ёсць гіпотэзы наконт правапісу суф. -ава(-ява)? | Робяць вывад, запісваюць у сшытак. |
| Правапіс якіх суф. не хапае ў тэме ўрока? | -ава(-ява). Дапісваюць у тэму ўрока |

**6. Праверка правільнасці рашэння праблемы.**
Зверце вывад з матэрыялам, змешчаным у дапаможніку “Беларуская мова ў табліцах і схемах” на с.98. Раскажыце адзін аднаму.

**7. Фізхвілінка.**
**8. Рэалізацыя новых ведаў.**
Праца па рознаўзроўневых заданнях.
**9. Праверка па ключы. Карэкцыя.**
**10. Падагульненне.**
**11. Рэфлексія.** (Метад КМ “Поле сіл”)
**12. Дам. заданне.**
**13. Акрэсленне задач на наступны ўрок.**
Замацаванне тэмы, напісанне слоўнікавага дыктанта.